ПОШУКІ ЗНАХОДКІ

# ГІСТОРЫЯ З МАЛА-БАГАМОЛАЎСКАЙ ВУЛІЦАЙ

Смаленск, Малая Багаслоўская вуліца, дом № 5. Гэты адрас добра вядомы даследчыкам жыцця і творчасці Янкі Купалы. Менавіта там, недалёка ад храма Іаана Багаслова, помніка дойлідства 12-га стагоддзя, ад якога і атрымала найменне вуліца, восенню 1917 г. пасяліўся старшы рабочы 16-га дарожна - будаўнічага атрада Варшаўскай акругі шляхоў зносін Іван Дамінікавіч Луцэвіч. Менавіта там Янка Купала будзе жыць да студзеня 1919 г., да пераезду ў Мінск, у сталіцу толькі што абвешчанай Беларускай Савецкай Рэспублікі. У час Вялікай Айчыннай вайны хатка, дзе жыў пясняр, не ўцалела, і смаленскаму архівісту М. Лявіціну, аўтару гісторыка-літаратурнага нарыса пра смаленскі перыяд жыцця песняра, старажылы змаглі толькі паказаць месца, дзе яна стаяла.

Янка Купала ў 1922 г. у лісце да свайго колішняга апекуна Б. Эпімах-Шыпілы ўспамінаў пра жыццё ў Смаленску: «Там, жывучы праз увесь цяжкі і жудкі 1918 г., я папраўдзе быў, як непрытомны». Але, як слушна падкрэслівае ў даследаванні «Перачытваючы «Спадчыну» Янкі Купалы» літаратуразнавец Валянціна Гапава, «памылкова было б уяўляць Купалу гэтага часу адлучаным ад гулу жыцця, поўным нерашучасці і пасіўнага чакання... Жывое абліччa паэта паўстае шматгранна — і ў творчасці, і ў чалавечых сувязях з тымі, хто таксама глыбока быў заклапочаны справамі рэвалюцыі і радзімы...»

...Што Аляксандр Чарвякоў, будучы «ўсебеларускі стараста», у красавіку 1918 г. прыязджаў у Смаленск, мы ведаем, перш за ўсё, дзякуючы бальшавіцкай газеце «Звезда», якая ў нумары за 13 красавіка змясціла паведамленне пра дзейнасць Беларускага нацыянальнага камісарыяту (Белнацкома), камісарам якога і з'яўляўся тады А. Чарвякоў. Але чытачу, каб азнаёміцца з гэтым дакументам, не трэба шукаць «Звезду» за красавік 1918 г.: дастаткова разгарнуць 1-ы том зборніка дакументаў «Барацьба за Савецкую ўладу на Беларусі», дзе на старонках 76—77 і перадрукавана патрэбнае паведамленне: «Беларускі нацыянальны камісарыят пры Народным камісарыяце па справах нацыянальнасцей эвакуіраваны ў Маскву і часова размясціўся на Поварскай вул., д. № 52. Там жа размяшчаюцца і весткі камісарыяту — газета «Дзянніца» (ранішняя зорка)». Далей расказвалася пра арганізацыйную будову Камісарыяту і падкрэслівалася мэта яго дзейнасці: «садзейнічаць узняццю культурнага ўзроўню і палітычнай самасвядомасці Беларусі». Заканчвалася паведамленне такімі словамі: «Для ўстанаўлення сувязі з абласным Саветам Заходняй вобл. на з'езд Саветаў у Смаленск прыехаў камісар па справах беларусаў т. Чарвякоў. Бачыць можна штодзень да 10 гадз. раніцы. Адрас: Мала-Багамолаўская, д. № 5». Як вынікае з абвесткі, А. Чарвякоў спыніўся ў Смаленску ў доме № 5 па Мала - Багамолаўскай вуліцы, удзельнічаў у рабоце 2-га з'езда Саветаў Заходняй вобласці, які праходзіў з 10 па 14 красавіка.

Вуліца Мала-Багамолаўская, 5... Смаленскі ж адрас Купалы — Малая Багаслоўская, 5... А раптам у зборніку дакументаў памылка? А раптам у «Звезде» ўказваўся Купалаў адрас — Малая Багаслоўская, 5? Тады можна будзе меркаваць, што камісар Белнацкома А. Чарвякоў спыняўся ў Смаленску ў Купалавым доме! Трэба азнаёміцца з першакрыніцай, «Звездой» за 13 красавіка. Не, складальнікі зборніка пры перадруку памылкі не зрабілі, у газеце таксама Мала-Багамолаўская, 5. Перачытваю кнігу гісторыка і пісьменніка У. Якутава пра

Віталь СКАЛАБАН.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам
дакумента можна
азнаёміцца ў бібліятэцы